Отсюда григорьевская типология героев русской литературы – их два противоположных типа: «смирный» и «хищный»[4]. Критик предвосхитит в таком понимании выводы русских философов конца XIX – начала XX века: Н.Бердяева, Н. Лосского и др. «Смирный» характер – исконно русский, не конфронтационный, «хищный» – индивидуалистический [4].

«Индивидуалистическим» типом в драме представлены молодые псковичи. Однако их образы вызывают не меньшее восхищение критика, чем смиренные миротворцы – князь Юрий Токмаков и люди старшего поколения.

Таким образом, в героях-псковичах переломная в истории Пскова эпоха выявила самое главное в двух типах русского национального характера – терпение и смирение перед властью в людях старшего поколения, умудренных жизненным опытом, и верность традиции вольной республике в молодом поколении. Но при этом всех их объединяет соборность, сила духа и любовь к родному городу.

**Литература**


1. Григорьев, А.А. Явления современной литературы, пропущенные нашей критикой. Псковитянка, драма Л. Мея. / А.А. Григорьев / Время.1861. № 4.[Электронный ресурс] – Режим доступа: http://www.philolog.ru/filolog/writer/pdf/javlengr.pdf. – Дата доступа: 10. 01.2017.
2. Григорьев, А.А. Взгляд на русскую литературу со смерти Пушкина / А.А. Григорьев. Искусство и нравственность. – М.: Современник, 1986. – С.70-143.
3. Егоров, Б.Ф. Аполлон Григорьев / Егоров Б.Ф. Избранное. Эстетические идеи в России XIX века. – М.: Летний сад, 2009.– С.176 -231.
4. Житкова, Л.Н.Народность как эстетическая категория в русской литературной критике XIX века. / Л.Н.Житкова. / [Электронный ресурс] – Режим доступа: journals.urfu.ru›http://yandex.ru/clck/jsredir?from=yandex.ru%3Bsearch%2F%3Bweb%3B%3B&text=&etext=1338.fzRY5nxIXEaJBPO2lFiyu_b48PbVoE-xH612TzCZ_0R9BcM6NWcDC3tlYrfq-MWq8Z2GmPFGJnmIa8poY0SCpLR2RotJNe5_R8Gkoo5ibQj9e9TDhh03ciPRVDv4wx_XUKvRPIngv05LwWgCokEGEgYy4-p-vccm-U5r_AG4-me5sMXPpK4a1GLepWrTy_PmT0Y9pzHJLGLnU04jsfhCuZoRzND28Fk6pow5BJ-bBXtbuCXCKooxR2qs3-0VTU9O.c6e4e510abe08efb2e5be0f19344c3b95eac6988&uuid=&state=PEtFfuTeVD4jaxywoSUvtB2i7c0_vxGdxRuXfLZHQfBNCJIHCARR3B6nJBWFkYRWGrq5Tq9CDmwo_zdOySpB6BwK3ubM1KCq&data=UlNrNmk5WktYejY4 – Дата доступа: 12.02.2017.
5. Журавлева, А.И. «Органическая критика» Аполлона Григорьева / Григорьев А.А. Эстетика и критика. – М.: Искусство, 1980. – С.7-47.
6. Иванов, Е.П. Псковский характер в контексте исторического процесса / Е.П. Иванов. Псков в российской и европейской истории: Международная научная конференция: В 2 т. Т. 2. Моск. Гос. ун-т печати. – М.: МГУП, 2003. – С.3-12.
7. Мей, Л.А. Псковитянка. / Л.А. Мей Избр. Произведения. – Л.: Сов.писатель, 1972. – С. 423-532.



**N. Tsvetkova**
Pskov State University
e-meil: tsvetkova48@yandex.ru


**Pskovityanka" by L.A. Mey by estimate of A.A. Grigorjev: the Pskovian' s image**


*Key words:L. Mey, A. Grigorjev, the drama "Pskovityanka, review, female image, national character, Pskovian' s image.*



*The article explores the unknown up to the present time A.A. Grigorjev's critical essay about the drama "Pskovityanka" by L.A. Mey, riewes his assessment of the Pskovians'images and display of their characters in a critical period in the history of the Pskov veche republic*.



**А.М. Чарнавокая**
Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі
e-mail: lecsa87@gmail.com



УДК 821.161.3.09


## АКТУАЛІЗАЦЫЯ ПРЫНЦЫПАЎ САВЕЦКАЙ ГЕНДАРНАЙ ПАЛІТЫКІ Ў БЕЛАРУСКАЙ ПРОЗЕ 1920-х - 1930-Х ГАДОЎ


*Ключавыя словы: сацыялістычны рэалізм, выхаваўчая функцыя мастацтва, мадэрнізацыя, адукацыя, мастацкая рэпрэзентацыя жанчыны.*



*У артыкуле на матэрыяле апавяданняў Якуба Коласа, Змітрака Бядулі, Кузьмы Чорнага даследуюцца жаночыя вобразы, якія паўстаюць ілюстрацыяй да савецкіх лозунгаў «вызвалення жанчыны», далучэння жанчыны-сялянкі да «новага жыцця»; аналізуюцца сутнасныя змены ў мастацкім падыходзе да рэпрэзентацыі жанчыны-сялянкі ў параўнанні з прозай дарэвалюцыйнага перыяду.*


Савецкая эпоха сталася для беларускай культуры часам абсалютызацыі сацыяльнай, выхаваўчай функцыі мастацтва. Так, у прамове сакратара ЦК ВКП (б) А.Жданава на Першым усесаюзным з'ездзе савецкіх пісьменікаў (1934 г.) было адзначана, што «праўдзівасць і гістарычная кан-




Репозиторий ВГУ

крэтнасць мастацкага твора павінна спалучацца з задачай ідэйнай пераробкі і выхавання працоўных людзей у духу сацыялізма» [1]. Гэтая фармулёўка была пакладзена ў аснову вызначэння сацыялістычнага рэалізма, дадзенага ва Уставе Саюза савецкіх пісьменнікаў. Але адпаведная практыка склалася значна раней: на працягу дзесяцігоддзя напярэдадні з'езда многія пісьменнікі папулярызавалі палітычныя і сацыяльныя ідэі савецкай улады, адлюстроўвалі жыццё ў святле камуністычных ідэалаў, імкнуліся сфарміраваць станоўчае стаўленне да новых сацыяльных практык. У гэтым шэрагу можна назваць імёны такіх беларускіх аўтараў, як Якуб Колас, Змітрок Бядуля, Кузьма Чорны, Платон Галавач, Леаніла Чарняўская, творы якіх будуць разгледжаны ў гэтым артыкуле.

Пісьменнікі падрабязна апісвалі сацыяльныя змены, якія адбываліся пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі – не засталіся па-за ўвагай і рэформы ў сферы гендарных адносін. Бальшавікі імкнуліся ўраўняць жанчын у правах з мужчынамі і канчаткова вырашыць так званае жаночае пытанне. Ужо ў 1918 годзе жанчыны маглі свабодна абіраць прафесію, месца жыхарства, атрымліваць адукацыю, скасоўваць шлюб, атрымалі права на роўную аплату за роўную з мужчынамі працу. Як адзначае Алена Гапава, «У міжваеннае дваццацігоддзе адбыліся велізарныя культурныя і структурныя змены: з аднаго боку, быў створаны міф пра новых, свабодных жанчын, гераінь сацыялістычнай працы – работніц і сялянак. З іншага – адбыўся масавы прыток жанчын у прафесійную дзейнасць, была ліквідавана непісьменнасць і створана такая сістэма сацыяльнай абароны, пры якой развод і мацярынства па-за шлюбам перасталі быць экзістэнцыяльнымі пытаннямі» [2, с.156].

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі рэзка змяніліся прынцыпы, на якіх грунтаваліся нормы сямейнага, прыватнага жыцця. Жанчыны атрымалі большую свабоду ў вырашэнні пытанняў, якія тычацца асабістых адносін. Аднак «новая мараль» і ідэі «свабоднага кахання» выклікалі палеміку ў беларускай літаратуры і большасцю аўтараў ацэньваліся неадназначна, нават адмоўна. У якасці прыкладу можна назваць раман Змітрака Бядулі «Язэп Крушынскі», сатырычны раман Андрэя Мрыя «Запіскі Самсона Самасуя», апавяданні Якуба Коласа «У двары пана Тарбецкага», Кузьмы Чорнага «Справа Віктара Лукашэвіча», «Сцены».

Станоўчыя змены ў становішчы жанчын віталіся многімі айчыннымі пісьменнікамі: беларуская літаратура легітымізавала новыя сацыяльныя практыкі, фарміравала станоўчае стаўленне да інавацый і новых узораў паводзін, што адлюстравана ў шэрагу апавяданняў (Якуб Колас «Адукацыя» (1926), «Арыніна перамога» (1931), «Кінахроніка» (1935); Змітрок Бядуля «Дэлегатка» (1925); Леаніла Гарэцкая «Падарожніца» (1927), «Нянька» (1933), «Перамога» (1933); Кузьма Чорны «Радасць жанчыны», «Свята працы і свету», «Жаночая праўда і мужчынская крыўда» (усе – 1925) і інш.)

Пісьменнікі імкнуліся максімальна наглядна і даходліва прадэманстраваць высокую значнасць новых сацыяльных магчымасцей – і па сутнасці ілюстравалі гатовыя савецкія формулы, распрацоўвалі сюжэты, тыповыя для тагачаснай літаратуры. Адпаведна, большасць твораў гэтага перыяду мае адносную мастацкую вартасць. Тым не менш, увага да прозы 1920 – 1930-х гадоў можа быць апраўдана жаданнем разгледзець літаратурны твор як дакумент, як сведчанне эпохі. Аналіз жаночых вобразаў дазволіць прасачыць, як актуалізацыя прынцыпаў савецкай гендарнай палітыкі на старонках мастацкіх твораў прадвызначыла змены ў мастацкай рэпрэзентацыі жанчыны-сялянкі.

«Жаночае пытанне» заўсёды ўскосна закраналася ў беларускай прозе, асабліва пры абмалёўцы вясковага жыцця. Тыповая сялянка паўстае згорбленай, забітай горам кабетай, звыклай да мужавай лупцоўкі. Праблема сямейнага гвалту была істотнай для многіх вясковых жанчын; тым не менш, у нашаніўскім дыскурсе адным з галоўных аспектаў «жаночага пытання» паўстае праблема адукацыі. У савецкі час гэта праблема пачала рэальна вырашацца праз арганізацыю хатчытальняў, пунктаў па ліквідацыі непісьменнасці, вечаровых школ, рабфакаў – адпаведна, аптымістычны матыў атрымання адукацыі прысутнічае ў многіх творах гэтага перыяду, дзе галоўным персанажам з'яўляецца жанчына-сялянка. Гераіні альбо выразна ўсведамляюць неабходнасць адукацыі, альбо пачынаюць вучыцца грамаце разам з іншымі, каб далучыцца да «новага жыцця». І гэта памкненне выключна важнае для савецкай улады.

Так, адукацыя ў аднайменным апавяданні Якуба Коласа пазіцыянуецца як лепшая аздоба для маладой савецкай жанчыны, чым традыцыйныя атрыбуты жаноцкасці: макіяж, прычоска, капялюшык, «найчараўнейшая ўсмешка». «У той час, калі жанчына выходзіць з векавой няволі капіталізму, калі яна ідзе дарогаю будаўніцтва сацыялізму, ты займаешся глупствам, цешышся гэтаю эмблемаю мяшчанства,» [3, .119] – сварыцца студэнт Кузьма, прадстаўнік прагрэсіўнай часткі савецкага грамадства, на маладую жонку Насцю, якая сустракае яго прыхарошанай і ў пазычаным капялюшыку. Кузьма лічыць неадукаванасць галоўнай праблемай жонкі («у цябе, як у сялянкі, каторыя фактычна ў сэнсе розуму драмалі, ёсць патэнцыяльная энергія, якую трэба перавесці ў стан дынамічнасці, каб ад гэтага карысць была дзяржаве і працоўным масам» [3,с. 110]) Герой збіраецца вырашыць праблему неадукаванасці жонкі занадта радыкальна, што робіцца прычынай канфлікта ў гэтым гумарыстычным творы, дзе пісьменнік крыху іранізуе з патэтыкі савецкай ідэалогіі.



Рэпазіторый ВДУ

Але далёка не заўсёды вучоба маладой ці сталай жанчыны знаходзіць падтрымку ў сям'і. Якуб Колас адзначае, што імкненне да «кніжных« ведаў не характэрнае для вясковай кабеты ў сялянскай патрыярхальнай культуры. «І што сказалі б ёй дома, каб гэта яна там разлажылася кнігамі і села за навуку? На смех паднялі б: ці ж у яе гады вучыцца? Замуж выйшла, маладзіцаю стала, куды ўжо тут навука?» [3, с.116] – разважае Насця, згадваючы бацькоў-хутаран.

Яшчэ больш неверагодная метамарфоза адбываецца ў апавяданні Змітрака Бядулі «Дэлегатка»: п'яны Яўхім штодня б'е сваю жонку, і нават яе ўсмешка нагадвае «грымасу плачу». Аднойчы Аўгіня не вытрымлівае, бо муж накідваецца на яе з такой злосцю, «нібы знайшоў свайго заядлага ворага, якога во зараз трэба знішчыць» [1, с.176]. Кабету суцяшаюць дзяўчаты-камсамолкі – з гэтага моманту «нібы ў казцы цудоўнай, перад Аўгіняй разгарнулася новае цікавае жыццё. Па-першае, яе муж Яўхім пачаў менш піць і зусім перастаў біць яе, узяўся за наладжанне сваёй гаспадаркі. Па-другое, Аўгіня, як ні дзіўна, пачала вучыцца чытаць і пісаць» [1, с.179]. Пісьменнік яскрава супрацьпастаўляе сумнае мінулае кабеты яе шчасліваму жыццю пасля першых крокаў насустрач новаму ладу.

Феерычнасць змен у сямейным жыцці гераінь адпавядае памкненню аўтараў усімі сродкамі заахвоціць чытачак да адукацыі, выбару на карысць «новага жыцця». Падтрымка жанаддзелу і камсамола дазваляе жанчыне адчуваць сябе больш абароненай; усведамленне, што новая ўлада апекуецца над кабетамі, нейтралізуе агрэсію нават тых герояў-мужчын, якія надзелены негатыўнымі характарыстыкамі. Пісьменнікі, безумоўна, ідэалізавалі перспектывы жанчыны ў савецкім грамадстве. Тым не менш, адукацыя ў некаторых выпадках сапраўды дазваляла сялянцы заняць больш высокі сацыяльны статус, як мінімум стаць «перадавой жанчынай вёскі».

У творах савецкай літаратуры выразна праводзіцца думка, што атрымаць адукацыю «з рук» савецкай улады – значыць прыняць тыя ідэі, правілы, устаноўкі, якія санкцыянуюцца праз зацверджаны ёю тэкст. «навучыць савецкага чалавека чытаць, пісаць і лічыць для бальшавікоў было яўна недастаткова. Адной з галоўных задач у галіне культурнага будаўніцтва было фарміраванне «новага чалавека», які вылучаўся б адданасцю ідэям камунізма, рэвалюцыйным настроем, дысцыплінаванасцю і духам калектывізма» [6, с.45].

Пісьменная жанчына пачынае арыентавацца ў сістэме норм, забарон, прадпісанняў, замацаваных савецкай уладай, і, адпаведна, робіцца вельмі патрэбным чалавекам.

«Навучаныя жанчыны павінны былі ўступаць у шэрагі культармейцаў і такім чынам стаць узорам для пераймання. Акрамя таго, жанчыны, якія атрымлівалі адукацыю, маглі займаць пасады ва ўстановах культуры, і такім чынам дэманстраваць, што пісьменнасць дапамагае рухацца па кар'ернай лесвіцы – гэта разглядалася як стымул, каб распачаць навучанне» [6, с.55]. Прыклады такога кар'ернага роста шматкроць апісваліся ў перыёдыцы – не толькі ў нарысах і нататках, але таксама ў мастацкіх творах. Так, у апавяданні Якуба Коласа «Арыніна перамога», Арына – былая батрачка – прыходзіць у горад, дзе вучыцца грамаце, а потым разам з брыгадай едзе ў падшэфны калгас. У вагоне яна заўважае надпіс «Для некурашчых» – і робіць заўвагу дзядзькам, якія кураць. «Арынка не магла стрымацца, каб не выкарыстаць сваёй пісьменнасці і права пратэставаць супраць курцоў у вагоне для некурашчых» [3, с.316] – фактычна, гераіня ўпэўніваецца ў тым, якую рэальную ўладу мае друкаванае слова. Мужчыны падпарадкоўваюцца – і ў гэтым «таксама была Арынчына радасць і перамога». Поспехі дзяўчыны робяцца магчымымі найперш дзякуючы спрыянню савецкай улады, якая «сапраўды абараняе інтарэсы беднаты і не дазваляе, каб яе крыўдзіла і эксплуатавала living людское павуччо» [3, с.214].

Савецкая ўлада можа прыйсці на дапамогу жанчыне ў самых розных сітуацыях. Напрыклад, Леаніла Чарняўская ў апавяданні «Перамога» апісвае гаротнае жыццё вясковай удавы, якая выпраўляе сына-піянера дапамагаць «папу» ў царкве, каб такім чынам палепшыць становішча сям'і. Школьнікі заўважаюць хлопчыка каля храма і збіраюцца выключыць з піянераў, але своечасова разбіраюцца ў сітуацыі і пастанаўляюць дапамагчы яго маці. У фінале апавядання вяскоўцы глядзяць антырэлігійную п'есу і гераіня – ужо тэхнічная працаўніца ў кааператыве – смяецца з дзеі ў першым шэрагу. Такім чынам, праца ў савецкай установе пазіцыянуецца як рэальная магчымасць пачувацца больш упэўнена і самастойна – аднак падтрымка савецкай улады прадугледжвае з боку гераіні «крокі» да «новага жыцця».

Беларускія пісьменнікі 1920-х гадоў імкнуцца сфарміраваць пазітыўнае стаўленне да многіх іншых рэалій. Так, наглядна тлумачыцца значнасць ясляў; падкрэсліваецца, што і без вянчання ў царкве шлюб можа быць шчаслівым; сялянка не мае вялікага клопату з тым, каб змяніць месца жыхарства ці сферу дзейнасці.

Актуалізацыя прынцыпаў савецкай гендарнай палітыкі абумовіла кардынальныя змены ў рэпрэзентацыі жанчыны-сялянкі. Так, у дарэвалюцыйнай беларускай прозе вясковая жанчына часцей за ўсё рэпрэзентавалася як вобраз-ахвяра; у сатырычных і сацыяльна-бытавых апавяданнях часта выкарыстоўваліся запазычаныя з фальклору вобразы («злая жонка», «злая нявестка»,



Рэпазіторый БГУ

«сварлівая суседка»). Паводзіны жанчыны, неадпаведныя нормам традыцыйнай культуры, высмейваліся альбо былі прычынай казусу ці сямейнага канфлікта. Прастора, у якой дзейнічала гераіня, абмяжоўвалася хатай, вясковай вуліцай. Адпаведна, жанчына выяўлялася выключна ў стасунках з членамі сям'і альбо аднавяскоўцамі. Жыццё сялянкі паўставала складаным і аднастайным, грамадства было нібыта абыякавым да яе праблем – адсюль і крыўда гераіні «на «увесь свет» (вёска і ваколіца) за тое, што не бараніў яе, што адносіўся да яе нібы-та няўважліва» [1, с.178].

У паслярэвалюцыйнай прозе жанчына-сялянка выяўляецца ў іншай перспектыве. Літаратура дэкларуе, што кожны савецкі чалавек можа далучыцца да стварэння новага жыцця, яго ўнёсак у вялікую справу пабудовы «новага грамадства» ці рэалізацыі непасрэдных вытворчых і гаспадарчых задач абсалютна магчымы і ўхвальны. Адпаведна, гісторыя пераўтварэння несвядомай сялянкі ў «перадавую» савецкую жанчыну робіцца цэнтральнай для шэрагу апавяданняў. Сфера дзейнасці і сфера стасункаў для вясковай жанчыны значна пашыраецца – яна атрымлівае адукацыю, пачынае працаваць у калгасе, кантактуе не толькі з суседзямі і членамі сям'і, але і з прадстаўнікамі ўлады, яна мае права на ўласны выбар і пункт гледжання (вядома ў тым выпадку, калі ён супадае з устаноўкамі савецкай улады), прымае рашэнні, якія маюць безумоўную сацыяльную значнасць. Змяняецца і пазіцыянаванне стасункаў паміж жанчынай і грамадствам. Прадстаўнікі ўлады (камсамол, жансавет, кіраўніцтва калгаса) абараняюць правы жанчыны, могуць прыйсці на дапамогу, паспрыяць у вырашэнні жыццёвых праблем.

Выбар на карысць «новага жыцця» – магчымасць вырашыць праблемы, якія ў дарэвалюцыйнай прозе паўставалі непазбежнымі для вясковай жанчыны. Ціхмянасць, стрыманасць, пакорлівасць – якасці, якія былі прычынай прыніжанага становішча вясковых кабет – адназначна не разглядаюцца ў савецкай літаратуры як «украса» жанчыны. Вітаецца актыўная жыццёвая пазіцыя, цікавасць да новага, імкненне змяніць сваё жыццё, далучыцца да новых сацыяльных практык, здольнасць крытычна ацаніць мінулае. Але да «правільнага выбару» жанчыну падштурхоўвае хутчэй пэўная праблемная сітуацыя, глыбокае эмацыянальнае ўзрушэнне, чым асэнсаванне свайго жыццёвага досведу і тым больш агульных грамадска-палітычных праблем.

Зразумела, што разгледжаныя творы не столькі адлюстроўвалі савецкую рэчаіснасць, колькі фарміравалі ўяўленне пра пажаданыя змены. Новы падыход да распрацоўкі жаночых вобразаў можна лічыць не толькі належным падмацаваннем да паступовага вырашэння «жаночага пытання», але і складнікам глабальных трансфармацый, якія адбываліся ў беларускай літаратуры ў 1920 – 1930-я гады.

**Літаратура**


1. Бядуля, Б. Збор твораў : у 4 т. / З. Бядуля. – Мн.: Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1951. – Т. 1: Апавяданні. 1912 – 1939 гг. – 452 с.
2. Женщины на краю Европы / Под ред. Е. Гаповой. – Мн. : ЕГУ, 2003. – 436 с.
3. Колас, Я. Збор твораў : у 12 т. / Я. Колас – Мн.: Беларуская навука, 2009. – Т. 6. Апавяданні (1925 – 1951), раннія празаічныя творы (1900 – 1906), пераклады (1907) – 574 с.
4. Ревякина, А. А. О социалистическом реализме / А. А.Ревякина // А. Н. Островский, А. П. Чехов и литературный процесс XIX – XX вв.: Сборник статей в память об Александре Ивановиче Ревякине (1900-1983) / РАН. ИНИОН. Центр гуманит. науч.-информ. исслед. отд. литературоведения; Редколл.: Ревякина А.А. (отв. ред., сост.), Ревякина И.А. (ред.-сост.) и др. [Электронный ресурс]. – 2003. – .Режым доступа: http://kostromka.ru/revyakin/literature/508.php#kostroma_r18. – Дата доступу: 01.02.2017.
5. Чорны, К. Збор твораў : у 8 т. / К. Чорны. – Мн.: Мастацкая літаратура, 1972. – Т. 1: Апавяданні. 1923 – 1927 гг.. – 554 с.
6. Фишева А. А. Общее образование взрослых на территории РСФСР (1930 – 1950-е гг.) : дис. ...канд. ист. наук: 07.00.02. / А. А. Фишева. – СПб, 2014. – 268 л.



**A. M. Tscharnavokaya**
The Yanka Kupala Institute of Literature Studies the Center for Belarusian Culture, Language and Literature Research of the National Academy of Sciences of Belarus
e-mail: lecsa87@gmail.com


**Actualization of the principles of Soviet gender policy in Belarusian prose of 1920–1930**


*Key words: social realism, social function of art, modernization, education, representation of female images.*



*The article analyzes female images, which exemplify the Soviet slogans of women's liberation and show, how to join «new Soviet life» (by novels of Yakub Kolas, Zmitrok Byadulia, Kusma Tschorny, etc.). Great changes in writer's approaches to the representation of peasant women in comparison with the prerevolutionary prose are also revealed.*


Рэпазіторый ВДУ